*Да 85-годдзя з дня нараджэння*

# АНАТОЛЬ ГРАЧАНІКАЎ: жыццё і творчасць



## Крыжаванка

**Па гарызанталі: 1.** Анатоль Грачанікаў вядомы як перакладчык на беларускую мову твораў украінскіх, малдоўскіх, літоўскіх паэтаў. Для дзяцей ён пераклаў вершы афганскіх літаратараў, якія ўвайшлі ў склад зборніка «Ватан — значыць ______». **2.** Слова, прапушчанае ў паэтычным радку з верша «Дрымотна ціснуцца кусты...»: «Я чую, як _____ кліча // На раздарожжы ўсіх дарог // Не разгубіць свайго аблічча». **3.** За гэту кнігу паэт у 1984 годзе атрымаў званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР. **4.** Кім па прафесіі быў бацька Анатоля Грачанікава — Сямён Трафімавіч? **5.** Часопіс, галоўным рэдактарам якога А. Грачанікаў быў у 1982—1991 гг. **6.** Сваё жыццёвае крэда Анатоль Грачанікаў апісаў у адным з вершаў: «Не трэба жыць як набяжыць. // Так жыць на свеце трэба, // Каб да апошніх дзён любіць // Людзей, _____ і неба». **7.** Узбекская паэтка, зборнік паэзіі якой пераклаў на беларускую мову Анатоль Грачанікаў разам з Эдзі Агняцвет. **8.** Назва першага паэтычнага зборніка А. Грачанікава. **9.** Прапушчанае слова ў назве зборніка А. Грачанікава «_____ на выспе» (1977). **10.** Жартоўная песня на словы А. Грачанікава, музыку напісаў кампазітар І. Лучанок. **11.** Газета «______ змена», у якой быў надрукаваны першы верш Анатоля Грачанікава. **12.** Прозвішча беларускага пісьменніка і земляка Анатоля Грачанікава; ён параіў маладому паэту пакінуць камсамольскую кар'еру і падацца ў Маскву на Вышэйшыя літаратурныя курсы. **13.** Прафесія, якую атрымаў А. Грачанікаў пасля сканчэння інстытута ў Гомелі. **14.** Слова ў назве верша па першым радку: «Як ападае _____...» **15.** Дзіцячы часопіс, у якім з 1976 года А. Грачанікаў быў галоўным рэдактарам. **16.** Месяц, у якім нарадзіўся А. Грачанікаў. **17.** Назва вёскі, дзе нарадзіўся Анатоль Грачанікаў.







**Па вертыкалі:** Беларускі паэт, перакладчык, аўтар вершаваных радкоў: «Беларускія // Краявіды... // Перазвоны // Азёр і бароў. // Над палеткамі // Бульба і жыта — // Песня // Велічных курганоў».

**Адказы.** *Па гарызанталі:* **1** — Радзіма; **2** — Айчына; **3** — «Палессе»; **4** — паштальён; **5** — «Маладосць»; **6** — зямлю; **7** — Зульфія; **8** — «Магістраль»; **9** — Дрэва; **10** — «Дударыкі»; **11** — Чырвоная; **12** — Шамякін; **13** — інжынер; **14** — ліст; **15** — «Вясёлка»; **16** — верасень; **17** — Шарпілаўка. *По вертыкалі:* Анатоль Грачанікаў.

*Склала* ***В. У. ПАЛАЎКО,***
*выкладчык УА «Пінскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя А. Я. Кляшчова».*